**Г. М. Мятліцкая**

УДК 008(476)(091)

Кафедра гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Рэспубліка Беларусь

# РОЛЯ І ЗНАЧЭННЕ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У артыкуле разглядаюцца асноўныя аспекты, звязаныя з увекавечаннем імя класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Асаблівая ўвага надаецца літаратурным музеям і мемарыяльным комплексам.

**Ключавыя словы:** Янка Купала, творчая спадчына, грамадская дзейнасць, літаратурныя музеі, увекавечанне.

**Узор цытавання:** Мятліцкая, Г. М. Роля і значэнне Янкі Купалы ў культуры Беларусі / Г. М. Мятліцкая // София: электрон. науч.-просветит. журн. – 2022. – № 2. – С. 58–62.

**H. Miatlitskaya**

Department of History of Belarusian Literature, Faculty of Philology, Belarusian State University, Minsk, Republic of Belarus

# THE ROLE AND SIGNIFICANCE OF YANKA KUPALA IN THE CULTURE OF BELARUS

The article deals with the main aspects related to the immortalization of the name of the classic of Belarusian literature Yanka Kupala. Special attention is paid to literary museums and memorial complexes.

**Key words:** Yanka Kupala, creative heritage, public activity, literary museums, immortalization.

**For citation:** Miatlitskaya H. The role and significance of Yanka Kupala in the culture of Belarus. *Sophia.* 2022;2:58–62. Belarusian**.**

**Аўтар:**

**Ганна Мікалаеўна Мятліцкая** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.

*myatlitskayaan@bsu.by*

**Author:**

**Hanna Miatlitskaya** – PhD of Philology, Associate Professor of the Department of History of Belarusian Literature of the Faculty of Philology, BSU.



Сёлетні 2022 год для беларусаў адметны, на яго прыпадаюць дзве значныя юбілейныя даты – 140-годдзе з дня нараджэння класікаў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Дадзены артыкул прысвечаны вядомаму беларускаму паэту, драматургу, публіцысту, перакладчыку, грамадскаму дзеячу Янку Купалу, якому ў 1925 г., першаму сярод беларускіх творцаў, было прысвоена ганаровае званне народны паэт Беларусі (у сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці). У 1959–1965 гг. у нашай краіне прысуджалася Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы, самая высокая ўзнагарода за стварэнне высокаідэйных і высокамастацкіх паэтычных і драматургічных твораў на беларускай мове, з 1965 г. прысуджаецца Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы. Па рашэнні ЮНЕСКА ў міжнародным маштабе адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы [1, с. 27].

У чым заключаецца асноўнае значэнне творчасці Янкі Купалы, і якая роля яго асобы і дзейнасці ў гісторыі культуры Беларусі? Паспрабуем даць адказ на гэтыя пытанні.

«Творчасць Купалы – летапіс жыцця беларускага народа, адбітак нацыянальнага характару, нацыянальнага светаразумення і паэтычнага светаўспрымання на пераломных гістарычных рубяжах першай паловы XX стагоддзя. Яна вызначаецца глыбокай народнасцю, мастацкай арыгінальнасцю, нацыянальнай адметнасцю. Нацыянальна-патрыятычны, адраджэнскі пафас, свабодалюбівыя матывы, ідэі сацыяльнага і нацыянальнага разняволення, паказ народнага жыцця, гістарычнага мінулага Беларусі, філасофскае асэнсаванне жыцця і чалавека наогул, беларускага мужыка, інтэлігента – выхадца з народных нізоў, у прыватнасці, увасоблены ў яго творчасці ў непаўторныя жанрава-стылявыя формы, што сталі класічнымі асновамі беларускай лірыкі, эпасу, драматургіі і публіцыстыкі», – адзначылі А. А. Лойка і І. У. Саламевіч [1, с. 26]. Творы класіка ўключаны ў сучаснае грамадскае жыццё і ў сучасны літаратурны працэс як у сваім першапачатковым выглядзе, так і ў форме цытат; на новым гістарычным этапе не страчваюць актуальнасці, здольнасці ўражваць сваёй глыбінёй сённяшніх чытачоў, закранаць іх думкі і пачуцці, а таму ўдзельнічаюць у фарміраванні сучаснага вобліку нацыянальнай культуры і забяспечваюць пераемнасць традыцый.

У сучаснай тэатральнай прасторы актуалізаваны непаўторныя драматургічныя творы Янкі Купалы: нават у час пандэміі ставіўся спектакль «Паўлінка», які на працягу многіх гадоў з’яўляецца візітоўкай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, старэйшага і галоўнага тэатра нашай краіны. Шэраг відэазапісаў па творах класіка выкладзены ў інтэрнэце: вядомыя песні ў выкананні ансамбля «Песняры»: «Малітва», «Я не паэта», «Алеся», «Явар і каліна», «Спадчына»; спектаклі «Раскіданае гняздо» (пастаноўка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі (РТБД)); «Паўлінка» (пастаноўка Купалаўскага тэатра); пластычнага спектакля «У хаце» (на матэрыяле паэмы «Яна і я», пастаноўка Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра). У свой час у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага (Рускі тэатр) «Раскіданае гняздо» ставілася на беларускай мове. Два гады таму на кінастудыі «Беларусьфільм» была знята гістарычная драма «Купала». І гэта толькі частка культурных падзей і мерапрыемстваў, звязаных з асобай і творчай спадчынай класіка.

Значная роля Янкі Купалы ў дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Так, у артыкуле «Янка Купала, Якуб Колас і БДУ», падрыхтаваным А. І. Бельскім (гл. сайт narbel.bsu.by), адзначана, што Янка Купала – «адзін з ініцыятараў адкрыцця БДУ.

Ён ад самага пачатку падтрымліваў цесныя кантакты і сувязі з першай вышэйшай нацыянальнай установай Беларусі. Янка Купала быў асабіста знаёмы з першым рэктарам БДУ Уладзімірам Іванавічам Пічэтам (1878–1947), добра ведаў першых універсітэцкіх выкладчыкаў Івана Іванавіча Замоціна, Мікалая Андрэевіча Янчука, Яўгена Іванавіча Барычэўскага, Аляксандра Мікалаевіча Вазнясенскага, Міхаіла Мікалаевіча Піятуховіча, Адама Антонавіча Бабарэку і інш. Імя Янкі Купалы фігуруе ва ўніверсітэцкіх справаздачах за 1922–1923 гг.» [4]. У 1922 г. у актавай зале БДУ адбылося ўрачыстае пасяджэнне з нагоды 40-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, у 1920–1930-я гг. праходзілі і іншыя мерапрыемствы з удзелам паэта. У 1930 г. «Народны камісарыят асветы БССР устанавіў стыпендыю імя паэта на літаратурным аддзяленні педфака БДУ» [4].

Янка Купала і Якуб Колас былі сярод стваральнікаў Інстытута беларускай культуры (ІБК), папярэдніка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, і – разам з Я. Карскім, Я. Лёсікам, С. Некрашэвічам і інш. – сталі аднымі з першых супрацоўнікаў гэтай установы. Так супала, што нядаўна адзначалася 100-годдзе Інбелкульта, значнай датай для якога з'яўляецца 30 студзеня 1922 г., калі адбыўся першы сход ІБК. У ліпені 1924 г. было прынята Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры, згодна з якім членамі Інбелкульта лічыліся 93 чалавекі, з іх толькі 15 чалавек былі штатнымі супрацоўнікамі, бо наркамат выдзеліў усяго 15 пайкоў. У 1927 г. новы статут ІБК значна павысіў патрабаванні, якія прад'яўляліся да правадзейных членаў, і іх колькасць скарацілася – засталося 15 чалавек, сярод якіх былі і Купала, і Колас. Цяпер у склад Інбелкульта маглі выбірацца асобы, якія ўзбагацілі навуку або мастацтва сваімі працамі, што мелі асаблівае значэнне.

Янка Купала, як і Якуб Колас, працаваў у тэрміналагічных камісіях, пазней стаў акадэмікам Акадэміі навук Беларусі (1928) і Акадэміі навук Украіны (1929).

У 1920-я гг. Янка Купала быў адным з ініцыятараў стварэння і ўдзельнікам літаратурнага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў «Полымя» (часопіс «Полымя» і сёння з'яўляецца старэйшым і найбольш значным літаратурным часопісам на беларускай мове, выдаецца з 1922 г.; Янка Купала – адзін з яго арганізатараў, пастаянны дарадчык і аўтар).

Спрычыніўся творца і да пачатку выдання газеты «Літаратура і мастацтва» (выходзіць з 1932 г. у Мінску на беларускай мове), з першых дзён работы рэдакцыі газеты быў яе актыўным аўтарам і дарадчыкам.

Засяродзім увагу на беларускіх мясцінах, звязаных з біяграфіяй Янкі Купалы, дзе працуюць музеі і ўстаноўлены помнікі паэту, якія адыгрываюць значную ролю ў выхаванні маладых пакаленняў беларусаў. У чым адметнасць кожнага з музеяў і пра які перыяд жыцця паэта распавядаюць іх экспазіцыі?

### 1. Вязынка[1]

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка» заснаваны ў 1972 г. у Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці. Тут у 1881–1883 гг. бацькі будучага паэта арандавалі зямлю ў памешчыка С. Замбржыцкага. На беразе ракі Вязынка знаходзіцца адноўленая па архіўных апісаннях, чарцяжах і фотаздымках хата Купалы. У мемарыяльнай частцы хаты ўзноўлены інтэр'ер сенцаў і жылога пакоя. Атмасферу тагачаснага побыту ствараюць аўтэнтычныя рэчы канца XIX – пачатку XX ст. Літаратурна-дакументальная частка

[1] Тут і далей звесткі прыводзяцца паводле энцыклапедыі «Янка Купала» ў 3-х т. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017–2018.

экспазіцыі прысвечана ранняму перыяду жыцця і творчасці паэта (1882–1904). Тут прадстаўлены архіўныя дакументы гісторыі роду Луцэвічаў, фрагменты аўтабіяграфічных лістоў і ранніх твораў Купалы.

Бронзавы бюст паэта, выкананы скульптарам З. Азгурам, быў перавезены з Мінска і ўстаноўлены ў Вязынцы ў 1972 г.

Кожны год у Вязынцы ў дзень нараджэння паэта (7 ліпеня) праводзіцца рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі…». Пачынаючы з 1976 г., у адну з майскіх субот у Вязынцы праходзіць традыцыйны злёт студэнтаў-філолагаў БДУ.

2. Яхімоўшчына

Філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы адкрыты ў 2001 г. у в. Яхімоўшчына Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. Экспазіцыя створана ў хаце, дзе Купала жыў у 1906–1907 гг. падчас працы памочнікам вінакура на бровары ў маёнтку пана Любанскага. Менавіта тут былі напісаны творы, якія ўвайшлі ў першы паэтычны зборнік «Жалейка» (1908).

Мемарыялізацыя Яхімоўшчыны была распачата пры непасрэдным удзеле жонкі паэта У. Ф. Луцэвіч. Экспазіцыя, размешчаная ў аўтэнтычным будынку XIX ст., прысвечана станаўленню Купалы як нацыянальнага паэта, яго ролі ў беларускім адраджэнні пачатку XX ст. Ёсць і мемарыяльны пакой-кабінет паэта, інтэр’ер якога ўзноўлены па ўспамінах старажылаў Яхімоўшчыны.

3. Акопы

Філіял музея ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. з цэнтрам у в. Харужанцы адкрыты ў 1992 г. Хутар Акопы ў Мінскай губерні з восені 1909 г. арандавала маці паэта Б. І. Луцэвіч у памешчыцы Жалігоўскай, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі гэты хутар перайшоў ва ўласнасць маці і сясцёр паэта. У 1911–1926 гг. Янка Купала прыязджаў сюды амаль штогод. Тут ён напісаў больш за 80 вершаў, паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я», камедыю «Паўлінка», драму «Раскіданае гняздо», трагікамедыю «Тутэйшыя», вершаваны пераклад «Слова аб палку Ігаравым» (упершыню быў надрукаваны ў 1921 г. пад загалоўкам «Песня аб паходзе Ігара»). У канцы 1920-х гг. маці і сем’і малодшых сясцёр паэта трапілі пад раскулачванне, з-за гэтага мемарыялізацыя Акопаў доўгі час была немагчыма і распачалася толькі ў 1980-х гг.

На сядзібе былога хутара Акопы захаваліся рэшткі падмуркаў ад будынкаў хаты і гаспадарчых пабудоў, узведзены ўваходная брама і сімвалічны зруб на месцы калодзежа. Рачулка, якая жывіла сажалку, ператварылася ў невялікі ручаёк. Захаваўся валун, на якім, паводле ўспамінаў, любіў адпачываць Янка Купала пасля вандровак па ваколіцах. У 1982 г. да яго быў прымацаваны мемарыяльны знак са словамі з верша паэта «З кутка жаданняў». У 1992 г. недалёка ад музея створана кампазіцыя «Малады Купала» (скульптары А. Заспіцкі, Г. Мурамцаў). У наш час у Акопах адкрыта экспазіцыя па творчасці паэта.

4. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы

Гэты музей знаходзіцца ў парку імя Янкі Купалы ў Мінску па адрасе: вул. Янкі Купалы, 4. Архітэктары Іван Валадзько і Віктар Волчак спраектавалі спецыяльны будынак для Літаратурнага музея Янкі Купалы, які быў пабудаваны на месцы спаленага падчас Вялікай Айчыннай вайны дома, дзе ў 1927–1941 гг. жыў паэт. Музей быў заснаваны пры Акадэміі навук БССР 25 мая 1944 г. і адкрыты для наведвання ўжо ў верасні 1945 г. Арганізатарам і першым дырэктарам музея была У. Ф. Луцэвіч, жонка

паэта. У адным са старэйшых літаратурных музеяў Беларусі зберагаюцца прадметы духоўнай і матэрыяльнай культуры, звязаныя з жыццём і дзейнасцю паэта. Супрацоўнікі музея праводзяць шмат разнастайных мерапрыемстваў у Мінску і ў філіялах музея.

Побач у скверы знаходзяцца помнік Янку Купалу (1972, скульптары А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі, архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін) і фантан «Вянок» (адкрыты яшчэ ў 1950-х гг., а ў 1972 г. упрыгожаны скульптурам А. Анікейчыкам), які ў народзе называецца «Купалінкі».

5. Ляўкі

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі» заснаваны ў 1978 г. на беразе Дняпра ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., недалёка ад гарадскога пасёлка Копысь. Тут у 1935–1941 гг. на дачы жыў і працаваў Янка Купала, у чэрвені – жніўні 1935 г. ім быў напісаны ляўкоўскі цыкл вершаў. Будынак дачы згарэў у час Вялікай Айчыннай вайны, адноўлены ў 1981 г. па макеце мастакоў Я. Рамакостраўскага (пляменніка Янкі Купалы) і Ф. Анісовіча.

Літаратурная экспазіцыя адлюстроўвае жыццё і дзейнасць Купалы ў 1920–1930-я гг. У мемарыяльнай частцы, у пакоі, дзе жыў і працаваў творца, экспануюцца дакументы, рэчы, мэбля, якімі карыстаўся Купала. Зусім недалёка знаходзіцца Александрыя, дзе на Купалле ладзіцца музычны фестываль.

Такім чынам, мы назвалі асноўныя беларускія музеі, прысвечаныя народнаму паэту, і зусім не закранулі навуковае вывучэнне творчай спадчыны песняра, плённыя набыткі такой галіны сучаснага літаратуразнаўства, як купалазнаўства (і адпаведна – традыцыі правядзення канферэнцый «Купалаўскія чытанні» ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы і ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску); не згадалі пра адзіны ў Расіі музей Янкі Купалы ў сяле Пячышчы (філіял Нацыянальнага музея Рэспублікі Татарстан, адкрыты ў 1975 г. у кватэры, дзе паэт жыў у эвакуацыі з 13 лістапада 1941 г. да 18 чэрвеня 1942 г.); не назвалі помнікі паэту, пастаўленыя на Кутузаўскім праспекце ў Маскве і ў Араў-парку ў Нью-Ёрку (да 135-годдзя Купалы), два помнікі Янку Купалу, адкрытыя нядаўна ў Кітаі; не прывялі звестак пра новыя публікацыі кніг з творамі Янкі Купалы на беларускай мове і ў перакладах на іншыя мовы свету, пра зборы твораў, навуковыя даследаванні, энцыклапедыі, слоўнікі, зварот мастакоў і кампазітараў да творчасці класіка і інш. Шэраг мерапрыемстваў запланаваны на гэты год у сувязі з юбілеем нашага класіка. У іх ліку – канферэнцыя «Мова – літаратура – культура», прысвечаная 140-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа, на філалагічным факультэце БДУ (верасень 2022 г.).

Веліч асобы Янкі Купалы, яго значэнне для беларускай культуры даўно прызнана. Творы класіка знаходзяць свой водгук у сэрцах чытачоў не толькі як мастацкі скарб айчыннай, славянскай літаратуры, але і сусветнай, сталі духоўным набыткам чалавецтва.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / [рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск: Белар. Энцыкл., 1996–… – Т. 9: Кулібін – Малаіта. – 557 с.

2. Янка Купала: энцыклапедычны даведнік / БелСЭ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ імя П. Броўкі, 1986. – 727 с.

3. Янка Купала: энцыклапедыя ў 3 т. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2017–2018. – Т. 1. – 2017. – 399 с; Т. 2. – 2018. – 415 с.; Т 3. – 2018. – 495 с.

4. Янка Купала, Якуб Колас і БДУ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: narbel.bsu.by. – Дата доступу: 05.09.2022.